# «Пакінуць птушачку»

Мастацкая галерэя «Зачараваныя родным краем» Мазырскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя А.С. Пушкіна заўсёды радуе жыхароў горада новымі выставамі, цікавымі сустрэчамі са знакамітымі творчымі людзьмі.

Гэтым разам галерэя прапануе ўвазе наведвальнікаў жывапіс калінкавіцкага мастака і педагога Рыгора Сафронава. Сваёй выставе Рыгор Данілавіч даў назву «Каханне. Мастацтва. Жыццё», падкрэсліваючы гэтым сэнс сваіх карцін. З яго твораў сапраўды выліваецца жыццёвая энергія ўзнёслых пачуццяў і эмоцый, што акунае ў атмасферу прыгажосці і пазітыўных уражанняў.


На адкрыцці выставы

Творца адчувае прызванне не толькі ў ролі мастака, але і педагога. Аб гэтым ён марыў з дзяцінства. Таму на адкрыццё выставы запрасіў сваіх вучняў, старэйшых і малодшых. *«Я ведаў, што буду вучыць дзяцей,* – дзяліўся ўспамінамі мастак. – *Яны мяне вучылі. Я іх вучыў»*.

Рыгор Данілавіч мае свой метад навучання. Ён не трымаецца «кожнай літары» навучальнай праграмы. Лічыць, што нельга раўняць усіх пад адзін грэбень. Кожны вучань патрабуе асаблівага падыходу, трэба толькі націснуць на патрэбную «кнопачку». І кожны пачне ствараць – ствараць сваё, асабістае. І вопыт паказвае, што настаўнік мае рацыю. Дзеці малююць ад душы, становяцца прызёрамі розных конкурсаў, працягваюць вучыцца далей. А некаторыя ўжо маюць і свае персанальныя выставы.

*«У кожнай карціне,* – гаворыць мастак, – *частка майго сэрца і маёй душы»*. Ён параўновае сябе з паэтам: *«Як паэт хацеў расказаць, так я расказаў у сваіх карцінах»*. І яшчэ Рыгор Данілавіч лічыць, і так вучыць дзяцей, што пасля сябе трэба пакінуць след, альбо, як вучні кажуць, «пакінуць птушачку».

І сапраўды, выстава і сустрэча з мастаком дае чалавеку натхненне, жаданне і пасля сябе пакінуць добры след.

*Таццяна ПРАКОПЧАНКА,*
*г. Мазыр*